ПАСТАНОВА НАЦЫЯНАЛЬНАГА СТАТЫСТЫЧНАГА КАМІТЭТА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
5 лістапада 2019 г. № 110

# Аб змяненні пастановы Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь ад 29 верасня 2016 г. № 134

На падставе падпункта 8.10 пункта 8 Палажэння аб Нацыянальным статыстычным камітэце Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 жніўня 2008 г. № 445, Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці па прадстаўленні Міністэрства культуры у пастанову Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь ад 29 верасня 2016 г. № 134 «Аб зацвярджэнні формы дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 1-тэатр (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці прафесійнага тэатра» і ўказанняў па яе запаўненні» наступныя змяненні:

1.1. прэамбулу і пункт 1 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«На падставе падпункта 8.10 пункта 8 Палажэння аб Нацыянальным статыстычным камітэце Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 жніўня 2008 г. № 445, Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць па прадстаўленні Міністэрства культуры:

1.1. форму дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 1-тэатр (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці прафесійнага тэатра» (дадаецца) і ўвесці яе ў дзеянне пачынаючы са справаздачы за 2016 год;

1.2. Указанні па запаўненні формы дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 1-тэатр (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці прафесійнага тэатра» (дадаюцца) і ўвесці іх у дзеянне пачынаючы са справаздачы за 2016 год.»;

1.2. з пункта 2 словы «, падпарадкаваныя структурным падраздзяленням абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, або Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь» выключыць;

1.3. у форме дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 1-тэатр (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці прафесійнага тэатра», зацверджанай гэтай пастановай:

у рэквізіце «Інфармацыя аб адказнасці» словы «ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь» замяніць словамі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі»;

рэквізіт «Адрасная частка і тэрмін прадстаўлення» выкласці ў наступнай рэдакцыі:

| «Прадстаўляюць | Тэрмін прадстаўлення |
|---|---|
| юрыдычныя асобы – тэатры, якія маюць у сваім складзе прафесійную трупу (калектыў): | 20 студзеня |
| дзяржаўнай формы ўласнасці, падпарадкаваныя структурным падраздзяленням абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, | |
| структурнаму падраздзяленню абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры | |
| дзяржаўнай формы ўласнасці, падпарадкаваныя Міністэрству культуры, іншым дзяржаўным органам | 28 студзеня |
| прыватнай формы ўласнасці | 28 студзеня |
| Міністэрству культуры | |

| | |
|---|---|
| структурныя падраздзяленні абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, – агрэгаваныя першасныя статыстычныя даныя | 28 студзеня |
| Міністэрству культуры | |
| Міністэрства культуры – афіцыйную статыстычную інфармацыю | 10 лютага»; |
| Нацыянальнаму статыстычнаму камітэту | |

у рэквізіце «Індэкс і код формы» лічбы «0629506» замяніць лічбамі «0611514»;

1.4. з пункта 1 Указанняў па запаўненні формы дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 1-тэатр (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці прафесійнага тэатра», зацверджаных гэтай пастановай, словы «, падпарадкаваныя структурным падраздзяленням абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, або Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь» выключыць.

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**Старшыня** **І.В.Мядведзева**